УДК 821.161.3-4 Васючэнка

**А. І. Белая** (Баранавічы)

# МЕНТАЛЬНЫ ПАРТРЭТ БЕЛАРУСА Ў ЭСЭІСТЫЦЫ П. В. ВАСЮЧЭНКІ

Сучаснае беларускае мысленне найлепей выяўляецца ў форме інтэлектуальнага эсэ, а першая частка вядомага выслоўя Рэнэ Дэкарта «Я мыслю – значыць існую» ёсць інтэгральная матрыца эсэ. Няма эсэ без уласнага «Я» перадусім, але і няма эсэ без «Я», якое мысліць. Аднак не трэба блытаць эсэ з філасофскім трактатам. Так сцвярджае беларускі філосаф В. Акудовіч. На яго думку, «эсэ – не зусім чыстае мысленне, а вольнае дыханне мыслення. Гэта значыць, што эсэ мысліць не толькі ўласна мысленнем, а ўсёй сваёй дрогкай субстанцыяй» [1, с. 240]. Інакш кажучы, прадмет, што спасцігаецца эсэістычна, «нібы сам стварае дысцыпліну пра сябе, з аб’екта метадалогіі ператвараецца ў суб’ект, з паняцця, якое мысліцца, – у мысленчае [мыслящее] разуменне самога сябе» [4].

Эсэізм дазваляе дасягаць найбольшай змястоўнасці пісьма, спалучаючы рознаўзроўневыя і разнаякасныя паняцці. Гэтую асаблівую якасць насычанасці думкі, якая вызначаецца ўзаемаадштурхоўваннем і ўзаемапрыцягненнем разнародных паняццяў, М. Эпштэйн называе інтэлектуальнай пругкасцю [Там жа]. Эсэ, на яго думку, ёсць шматсастаўнае імя ўласнае свайго прадмета. Эсэіст мог бы напісаць аповед пра што заўгодна, зыходзячы з асаблівых, непаўторных уласцівасцей пэўнага прадмета. Такім прадметам для П. Васючэнкі як эсэіста з’яўляецца беларуская ментальнасць. Найбольш скандэнсавана аўтарская думка ў эсэ «Беларус вачыма беларуса». Яно адкрывае рубрыку «Выніковыя эсэ» ў аўтарскім зборніку «Ад тэксту да хранатопа». Як адзначае пісьменнік, «ва ўсіх спробах акрэсліць тып беларуса – ці робяць гэта суседзі, ці робяць свае, –

заўжды будзе прысутнічаць момант непрасветленасці, недапраяўленасці, недавыказанасці. <…> У Беларусі шмат чаго алагічнага, невытлумачальнага, не падуладнага сілагізму. У гэтым трагедыя і абранасць» [3, с. 124–125].

Варта таксама адзначыць аб'ектыўную запатрабаванасць эсэ ў пераломныя, памежныя эпохі, бо менавіта праз эсэістычнасць знаходзіць выйсце кантакт індывідуальнай і грамадскай свядомасці. Іманентная эсэ няпэўнасць карэлюе з хісткасцю новай карціны свету, а тэндэнцыя ўхіляцца як суцэльнага сцвярджэння, так і чыстага адмаўлення набліжае яго да ментальнасці творцы-беларуса як *сярэдняга* чалавека. Элементы эсэ ўжо з пачатку XX ст. арганічныя для дарожных нататак, лістоў, успамінаў, абразкоў, запісак, дзённікаў, замалёвак, імпрэсій, «вершаў у прозе» (ад Цёткі, Ядвігіна Ш., З. Бядулі, М. Гарэцкага да прозы «Маладняка», ранняй прозы К. Чорнага).

Вобразнасць у эсэ – элемент звышмастацкага цэлага. Уварванне мастацкага вобраза, метафары, будзённага або гістарычнага факта ў галіну мыслення таксама спрыяе стварэнню ўнутры яго пругкай сферы іншамыслення і неймавернасці. У эсэ «Беларус вачыма беларуса» такі эфект, у прыватнасці, стварае ўведзены П. Васючэнкам вобраз «мілай маскоўскай знаёмай», якую здзіўляюць і ўражваюць нелагічныя/супярэчлівыя рысы нашых суайчыннікаў (але разам з тым пры нагодзе яна згадвае пра свае тры кроплі беларускае крыві…). Такі прыём дазваляе аўтару ажыццявіць погляд збоку на асобныя ментальныя рысы беларусаў, і асабліва некампліментарныя. Аўтар эсэ так выказваецца пра пакручастыя шляхі беларускай самаідэнтыфікацыі: «Беларуская асаблівасць палягае ў тым, што мы пачынаем прыдумваць сябе пасля таго, як нас ужо нехта прыдумае. Гэтая чужая думка пачынае свярбець, і тады беларус мусіць думаць пра сябе сам, ужо ў мэтах самазахавання» [3, с. 122].

Беларусаў, старэйшых па гістарычным узросце, прывучылі выконваць ролю меншых братоў пры моцных суседзях, але на гэтую ролю, адзначае П. Васючэнка, мы ўнутрана не згадзіліся. Паводле слушных разваг пісьменніка, кожны народ сябе прыдумвае – праз саманазву, міф і прыхарошаную гісторыю. Прыдумваючы сябе, выводзячы свой радавод з легендарных вытокаў, дабудоўваючы сваю гісторыю «за рознымі акупацыямі і адраджэннямі», мы стварылі беларуса міфалагізаванага. Але паколькі, як адзначалася, рабілі гэта запознена, то суседзі нашы ўжо надзялілі нас «такімі міфалагічнымі якасцямі, як звышцярплівасць, звышталеранцыя, забітасць, затурканасць, прыгнечанасць, мужыцкасць, бясконцая адданасць большаму брату» [3, с. 123]. Гэтай атрыбуцыі, аднак, настойліва супраціўляўся беларус гістарычны, які тым ці іншым чынам адыгрываў сваю ролю ў гістарычнай драме. Міф пра беларуса звышцярплівага, звышталерантнага, звышміралюбівага ўшчэнт рассыпаўся, калі ён браўся за зброю ў той час, як ад яго гэтага не чакалі. Трэці тып, вылучаны П. Васючэнкам, – беларус рэальны, які «прарос» з дзвюх вышэйзгаданых іпастасей у найноўшую гісторыю. І незалежна ад таго, выявіць ён у ёй пасіўнасць ці актыўнасць, – «у ягоных руках уласная экзістэнцыя і экзістэнцыя тых беларусаў, што прыйдуць пасля яго» [3, с. 124].

Палемізуючы са сваёй «маскоўскай знаёмай», П. Васючэнка абараняе «антрапалагічную рэпутацыю» беларуса гістарычнага, міфалагізаваную (папсаваную) у свой час М. Някрасавым, і супрацьпастаўляе погляду паэта погляд мастака. У палясоўшчыка на карціне І. Крамскога «вочы – бы два зледзянелыя возеры пад блакітна-сталёвым небам, іх позірк не абяцае чужынцу нічога добрага…» [3, с. 126]. Што да беларуса рэальнага, дык ён, лічыць П. Васючэнка, пераважна

захаваў тыя тыповыя рысы, што былі адзначаны яшчэ У. Караткевічам у эсэ «Зямля пад белымі крыламі». П. Васючэнка называе Беларусь краінай волатаў і снайпераў, а поспехі ў біятлоне звязвае з даўнейшымі партызанскімі якасцямі нашых суайчыннікаў – уменнямі страляць і ўцякаць…

Тутэйшасць – небездакорны, але, безумоўна, адметны тып нацыянальнай самаідэнтыфікацыі нашых суайчыннікаў, эмблема так званага патрыятызму месца [2, с. 76]. П. Васючэнка пераканаsuccessfully: Янка Купала ведаў кошт гэтаму «"тут" як цэнтру беларускай свядомасці, яго фатуму і болю, з якімі беларус не развітаецца, напэўна, ніколі, бо нават тутэйшасць як хвароба ёсць часткаю яго самога». І, змушаныя цягам стагоддзяў змяняць свае імёны і нават мовы, беларусы «дасюль захавалі сваё найпершае – пракаветнае "тут"» [3, с. 128–129]. Як паказаў гістарычны досвед, рознага роду прыхадні сыходзілі тымі ж дарогамі, што і з'яўляліся, а тутэйшы чалавек працягваў жыць на сваёй зямлі.

Патрыятызм месца ўвасабляецца ў адносінах беларуса да свайго жытла. Хата – адзін з дамінантных локусаў нацыянальнай культуры. «За някідкай, нецікавай абалонкаю дзеецца ўласная містэрыя, таямніца, дзяліцца якой беларус ні з кім не жадае. Душа як хата, хата як душа – сімвалы беларускага эзатэрычнага існавання, адменнікі дзвюх сакраментальных формулаў яго існавання: "Я тут" і "Я ёсць"» [3, с. 132]. На першы погляд камусьці можа здацца, што беларус ахвотна адмаўляецца ад роднай мовы, ад суверэнітэту як нацыянальнага дому. Але насамрэч, сцвярджае П. Васючэнка, ён іх нікому не аддасць.

Гістарычна сфарміравалася ў беларусаў і такая рыса, якую П. Васючэнка называе звычкай да самапрыбяднення («А беларусы ж нічога не маюць…»). Аднак, як ён перыфрастычна сфармуляваў, зборліваму беларусу не пагражае галодная смерць: апошняга мяшка з бульбай у яго не будзе ніколі! Нездарма беларус, на думку аўтара, і сёння здзіўляе сваёй бульбаманіяй (як працягам геаманіі). І, зноў жа, прага працы на зямлі не сведчыць пра тое, што беларусы апанаваныя голадам. «Гэта сведчанне неспатоленага голаду духоўнага, настальгіі па "сваім". Беларусу важна, каб на стале ў яго было сваё – "свая цыбулька, свой часнок"» [3, с. 139].

Адметнасць беларускага духу П. Васючэнка метафарызуе як блукаючую ваду падземнага возера. «Яго засыпаюць жвірам, заганяюць у падземныя лабірынты, і ніхто не ведае, дзе ён паўстане далей. Ён неўміручы, як гэтая блукаючая вада» [3, с. 140]. Адна з формаў захавання беларускага духу – так званая ўнутраная эміграцыя, якая не патрабуе ад'езду ў іншыя краіны. (З. Бядуля ў рамане «Язэп Крушынскі» ўжывае выраз «нутраныя замежнікі», які ўзыходзіць да часоў ідэалогіі РАППа.). Нашы паэты маўчалі гадамі, адзначае П. Васючэнка, а мова – дзесяцігоддзямі. Пакрыёмага існавання амаль ніхто не заўважаў да таго часу, пакуль беларусы зноў не выходзілі з лабірынту. І. Мележу належыць адзін з вобразных этнонімаў беларусаў – «людзі на балоце». П. Васючэнка інтэрпрэтуе яго, маючы на ўвазе такія ментальныя рысы нашых суайчыннікаў, як, з аднаго боку, вонкавы спакой, а з другога – непрадказальнасць. Гэтую стыхію рызыкоўна выпрабоўваць, засцерагае аўтар эсэ, і прыгадвае яшчэ адну асаблівасць балота: на ім немагчыма што-небудзь трывалае збудаваць, але і разбурыць дарэшты таксама немагчыма. «Балота – не мора, каб бушаваць і бурапеніць» [3, с. 140].

Важнай рысай ментальнага партрэта кожнага народа з'яўляюцца яго ўяўленні пра іншыя народы (гетэрастэрэатыпы) і адносіны да іх прадстаўнікоў. П. Васючэнка выказвае думку пра тое, што ў беларусаў няма вялікай любові да якога-небудзь іншага народа ці нацыі, але яны не маюць і грунтоўнай нянавісці

да іншых народаў. Ім не ўласцівы радыкальны нацыяналізм, беларускі месіянізм, ваяўнічы антысемітызм. Дададзім да гэтых разваг, што ў айчыннай літаратуры адбілася неадменная цікавасць герояў-беларусаў да прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей як да суб'ектаў адрознай (ці роднаснай) культуры або ментальнасці, схільнасць да параўнання асобных ментальных рысаў, пры гэтым не заўсёды на карысць уласных.

«Беларус не можа ненавідзець іншыя народы, але ў штурханіне, барацьбе за месца пад сонцам ёсць у яго свая стратэгія», – інтрыгуе чытача аўтар эсэ. І гэтай стратэгіяй з'яўляецца пацвельванне, «мяккая, ачышчальная тэрапія смехам. Беларус не жадае ліха сваім суседзям, калі іранізуе з іх» [3, с. 140]. І апраўдвае гэтую стратэгію беларусаў тая акалічнасць, што «найболей ахвотна і дасціпна яны пацвельваюцца з саміх сябе» [3, с. 143], пра сябе склалі і самыя крыўдныя показкі. А высмейваюцца ў першую чаргу тыя рысы, якія нам прыпісваюцца, у тым ліку правінцыялізм, вясковасць, ксенафобія, здрадлівасць. «Самаіронія беларусаў – папераджальны захад супраць нянавісці. Мы смяёмся з тых міфалагемаў, якімі нас надзяляюць, і прымушаем іншых смяяцца, а не ненавідзець» [3, с. 144].

Жыццё, хвароба, смерць – адзінкі шэрагу экзістэнцыйных дыхатамій, якія вызначаюць галоўнае, чым жыве чалавек, незалежна ад гістарычнага часу і ўмоў існавання. Людзі падобныя, пісаў Э. Фром, бо ўсім трапілася адна «чалавечая сітуацыя» [2, с. 84], але яны і ўнікальныя, бо кожны вырашае яе па-свойму. Невыпадкова П. Васючэнка закранае ў сваім эсэ адносіны беларусаў да хваробы і смерці. Менавіта ў час хваробы беларус выяўляе тую звышцярплівасць, якая часта робіцца прадметам міфатворчасці, і здольны вытрываць любы боль. Цягам доўгага часу сфарміраваўся страх простага беларуса перад лекарам і недавер да яго (мае месца і агульны недавер да вучоных людзей як прадстаўнікоў іншай сацыяльнасці). З гэтага вынікае і невялікае жаданне лячыцца ў бальніцы. Бо, як трапна заўважае П. Васючэнка, «няма ў нас такой ментальнае рысы – ахвоты да ляжання. У Беларусі Ілья Мурамец не пралежаў бы і трыццаці трох дзён, бо яго сцягнулі б з печы» [3, с. 146]. А ўлетку беларусам увогуле няма калі хварэць ды паміраць! Разам з тым, канстатуе назіральны аўтар, апелюючы як да рэчаіснасці, так і да мастацкай рэальнасці, менавіта ў бальніцах беларусы як нідзе выяўляюць цярплівасць ды законапаслухмянасць; бальніца прышчапіла беларусам кепскую звычку – хадзіць шоргаючы ды ўгнуўшыся. Можа, і ўсе хваробы пайшлі ад гэтай звычкі – існаваць угнуўшыся ды шоргаючы? Аўтарская іронія далей змяняецца аптымізмам, які ўласцівы эсэісту не толькі як чалавечай індывідуальнасці і суб'екту творчасці, а і як носьбіту рыс нацыянальнай ментальнасці: «Не абмінулі гэтай хваробы многія народы. У тым ліку і мы, грэшныя. Праходзіць час, і людзі выпростваюцца, паколькі кожнай хваробе пакладзены канец. Беларусы ж паводле ментальнасці настроены на неўміручасць, бо яны, як кажа філосаф Валянцін Акудовіч, абраныя вечнасцю» [3, с. 147].

Падсумоўваючы сказанае, адзначым: эсэістыка П. Васючэнкі – яскравы ўзор сучаснага інтэлектуальнага дыскурсу, які можна ахарактарызаваць не толькі як мысленчае спасціжэнне пэўнага прадмета, а і як асабовае самавыяўленне суб'екта творчасці. Эсэістычнае спасціжэнне беларускай ментальнасці, якая характарызуецца, па словах пісьменніка і навукоўца, праявамі непрасветленасці, недапраяўленасці, недавыказанасці, алагічнасці, невытлумачальнасці, непадуладнасці сілагізму, адпавядае паказчыкам інтэлектуальнай пругкасці (М. Эпштэйн). Яе ўзмацняюць мэтазгодная, дарэчная інтрузія мастацкага вобраза,

метафары, фактаў побыту і/ці з'яў быцця ў галіну мыслення. П. Васючэнка вылучае тры ўмоўныя тыпы беларуса і рэльефна абмалёўвае асноўныя рысы іх ментальнага партрэта. Асаблівая ўвага нададзена з'яве тутэйшасці, што маркіруе «патрыятызм месца» нашых суайчыннікаў, і, у яе кантэксце, – сімволіцы хаты. Даследаванне беларускай ментальнасці непадзельна ў эсэ П. Васючэнкі з іроніяй, якая рэпрэзентуе аўтара як суб'екта беларускай нацыі і культуры, а аб'ектыўна складае адметнасць дыскурсу пераходных перыядаў. Значнае месца ў аналізаваным творы займаюць не толькі аўта-, але і гетэрастэрэатыпы беларусаў; з пазіцый каштоўнаснай іерархіі нашага народа даследуюцца такія экзістэнцыйныя дыхатаміі, як здароўе і хвароба, жыццё і смерць.

ЛІТАРАТУРА

1. *Акудовіч, В.* На рыштаваннях горада Сонца / В. Акудовіч // Дзеяслоў. – 2020. – № 5. – С. 233–254.

2. *Белая, А. І.* Беларуская проза першай трэці ХХ ст. : станаўленне сістэмы персанажаў, тыпы і эвалюцыя мастацкіх характараў / А. І. Белая ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Баранавіцкі дзярж. ун-т. – Баранавічы : БарДУ, 2018. – 352 с.

3. *Васючэнка, П.* Беларус вачыма беларуса / П. Васючэнка // Ад тэксту да хранатопа. – Мінск : Галіяфы, 2009. – С. 122–150.

4. *Эпштэйн, М.* Эссеистика как нулевая дисциплина [Электронный ресурс] / М. Эпштейн. – Режим доступа : http://old.russ.ru/antolog/intelnet/mt_essayistic.html. – Дата доступа : 11.10.2020.